# ПРАБЛЕМА ГЕАПАЛІТЫЧНАГА ВЫБАРУ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПУБЛІЦЫСТЫКІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII СТАГОДДЗЯ)

*В.А. Міхедзька, Я.Дз. Алейнікаў*
*Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

Другая палова XVI – першая палова XVII ст. сталіся для беларускіх зямель Вялікага Княства Літоўскага часам вялікіх выпрабаванняў. Падзеі Лівонскай вайны, якая пацягнула за сабой заключэнне Люблінскай уніі з Польскім каралеўствам, за тым войны са Швецыяй, удзел у маскоўскіх падзеях «Смутного времени» і войны за Смаленск, цяжкім грузам усклаліся на беларускія землі, неслі велізарныя эканамічныя страты і разбурэнне прававых інстытутаў, абвострылі сацыяльныя і канфесійныя супярэчнасці. У гэтым кантэксце актуалізаваліся спрэчкі аб месцы Вялікага Княства ў геапалітычнай прасторы. У іх была ўцягнута перадусім шляхта – палітычная эліта дзяржавы. Мэта даследавання – асвятліць геапалітычныя арыентацыі шляхты, якія выяўляліся у яе успрыманні палітычных і культурных працэсаў, што адбываліся ў Актуальнасць даследавання абумоўлена як недастатковай распрацаванасцю ў айчыннай гістарыяграфіі, гэтак і існаваннем беларускіх зямель на сумежжы цывілізацый.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання сталі публіцыстычныя і палемічныя творы другой паловы XVI – першай паловы XVII ст., найперш, так званыя «Лісты» аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнобыльскага і ананімная «Прамова Мялешкі». «Лісты» Ф. Кміты-Чарнобыльскага напісаныя ў 1573–1574 гг., уяўляюць сабою данясенні кіраўніцтву Вялікага Княства Літоўскага аб становішчы на мяжы з Маскоўскай дзяржавай, палітычнай сітуацыі ў гэтай дзяржаве і, адначасова, змяшчаюць звесткі аб грамадска-палітычных настроях, што панавалі ў Вялікім Княстве Літоўскім у той час [1]. Ф. Кміта-Чарнобыльскі, таленавіты вайсковец, удзельнік шматлікіх баявых дзеянняў часоў Лівонскай вайны з Маскоўскай дзяржавай, аршанскі староста і сенатар Рэчы Паспалітай, рэпрэзентаваў пазіцыі сярэдняй і маёмаснай шляхты Вялікага Княства Літоўскага.

«Прамова Мялешкі» – адзін з найбольш вядомых помнікаў беларускай парадыйна-сатырычнай літаратуры канца першай трэці XVII ст.. Адсутнічае адзіны адказ на пытанне, ці “Прамова” з’яўляецца выключна літаратурным творам, ці пісьмовым варыянтам выступлення дзяржаўнага дзеяча ВКЛ Івана Мялешкі на сойме ў Варшаве перад каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам III. Твор напісаны старабеларускай мовай з багатымі фальклорнымі элементамі [2]. Ён адлюстроўвае ўспрынящце шляхецкім асяроддзем Вялікага Княства Літоўскага дзяржаўна-палітычных і культурных перамен, якія адбываліся пасля Люблінскай уніі 1569 г. У даследаванні выкарыстаны гісторыка-генетычны і гісторыка-сістэмны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Палеміка, што разгарнулася ў Вялікім Княстве Літоўскім пасля заключэння Люблінскай уніі з Польскім каралеўствам сведчыць аб наяўнасці заўважнага грамадскага скептыцызму што да збліжэння з Польшчай. Ф. Кміту-Чарнабыльскага, які ў сваіх лістах сведчыў адданасць сваёй дзяржаве і неаднойчы пацвердзіў гэта, абараняючы яе падчас Лівонскай вайны, не задавальняў дзяржаўны саюз Вялікага Княства Літоўскага з Польскай Каронай. Ён адкрыта заяўляў аб сваёй варожасці да польскіх палітычных парадкаў, якія ўкараняліся ў Вялікім Княстве Літоўскім насуперак айчынным традыцыям. У лісце да Астафія Валовіча, кашталяна троцкага, Ф. Кміта-Чарнобыльскі, каментуючы ад’езд караля Генрыка Валуа з Польшчы, даводзіў ад імя шляхты і ад сябе асабіста, што яны хацелі б бачыць на каралеўскім троне Рэчы Паспалітай не чужынца, якога б знатнага паходжанпя той

ні быў, а прадстаўніка сваёй мясцовай эліты: « ...мы тут, слуги вашей милости, розмавляем больш около своих, в(ашнх) м(илостей) панов, сенаторов нашых”. Перспектыва атрымаць у выніку выбараў паляка на пасад наступнага вялікага князя літоўскага палохала мясцовую шляхту: «Не дай бог ляху быть! Вырежет Лнтву, а Русь поготову!» У той жа час, Ф. Кміта-Чарнобыльскі бачыў сярод шляхты Вялікага Княства і пэўную колькасць прыхільнікаў збліжэння з Польшчай і разглядаў іх як небяспеку суверэнітэту дзяржавы: «Большы будет жычливъшый народу польскому, нижели своему!»[1; с.87]. Частка шляхты Вялікага Княства Літоўскага дапускала магчымасць удзелу ў выбарах новага караля і вялікага князя маскоўскага цара Івана Грознага або ягонага сына, спадзеючыся такім чынам спыніць войны, атрымаць цвёрдага і рашучага кіраўніка і замацаваць саюз паміж абедзвюма дзяржавамі. Ф.Кміта-Чарнобыльскі, прызнаўшы наяўнасць такіх палітычных сімпатый, успрымаў гэтыя сімпатыі скептычна і адзначаў, што шляхецкія вольнасці і канфесійны плюралізм Рэчы Паспалітай робяць гэты саюз немагчымым: «Хотя на сторону московского в той мере не треба се огледать: естли первей не хотел, не надеемся, абы и тепер хотел» [1; с. 88].

У часы панавання ў Рэчы Паспалітай дынастыі Ваза праблемы захавання дзяржаўнага суверэнітэту і культурнай самабытнасці Вялікага Княства Літоўскага яшчэ больш абвастрыліся. Непазбежнае ўзаемадзеянне прадстаўнікоў палітычнай эліты Вялікага Княства з польскім кіраўніцтвам і агульная інтэнсіфікацыя стасункаў з Польшчай не толькі садзейнічалі распаўсюджанню польскай мовы і польскіх звычаяў сярод шляхты Вялікага Княства. Значна больш заўважнай стала і непасрэдная прысутнасць тут выхадцаў з польскіх зямель, якія непрыхавана дэманстравалі пачуццё ўласнай перавагі перад мясцовай шляхтай. Пашыралася прысутнасць неславянамоўных выхадцаў з іншых еўрапейскіх краін – «немцаў». Значная частка шляхты Вялікага Княства Літоўскага насцярожана, а частакроць хваравіта і варожа ўспрымала з’яўленне чужынцаў у сваім асяроддзі. Гэтыя працэсы складанага ўзамадзеяння мясцовых традыцый і заходнееўрапейскіх ўплываў знайшлі яскравае адлюстраванне у ананімнай «Прамове Мялешкі». У гэтым творы выявіліся наяўнасць негатыўнага ўспрыняцця значнай часткай кансерватыўнай традыцыяналісцкай шляхты збліжэння з Польшчай і пашырэння кантактаў з заходнееўрапейскімі краінамі. Разам з тым, у творы прасочваецца і адваротнае, крытычнае стаўленне да кансерватыўных праціўнікаў збліжэння з еўрапейскімі краінамі як да людзей недалёкіх і прымітыўных [3; с. 315–316].

Заходнееўрапейскі уплыў на Вялікае Княства, адлюстраваны ў “Прамове Мялешкі”, умоўна можна падзяліць на два віды: уплыў «немцев», пад якімі разумеліся выхадцы з больш далёкіх неславянамоўных краін і уплыў палякаў-«ляхов».

У першую чаргу, распачынаючы аповяд пра «немцаў», аўтар звяртае ўвагу на дарагое адзенне замежнікаў, – кваціcтыя «перестые сукни»: «А коли сам немчино идеть, любо жена его поступаеть – через скурку скрипить, шелестить и дорогим пижмом воняет». У супрацьвагу новай іншаземнай модзе персанаж згадвае сціплыя і строгія адзенні часоў Жыгімонта І Старога, які ў вачах прамоўцы з’яўляўся абаронцам Літвы і Русі, захавальнікам айчынных традыцыйных каштоўнасцяў. Прывезеная з Еўропы дзявочая мода на адзенне з высокім падолам спадніцы («портукгали» ці «фортугали») выклікала абурэнне персанажа Мялешкі, які лічыў яго праявай разбэшчанасці, выкліканага адыходам ад традыцыйнага ладу існавання. [2, с. 675–677].

Не толькі на побытавае жыццё ўплывалі новыя іншаземныя павевы. «Немци» аказвалі ўздзеянне таксама і на палітычныя справы ў краіне. Галоўны персанаж «Прамовы» абураўся прысутнасцю іншаземцаў на кіраўнічых пасадах Вялікага Княства, што яўна пярэчыла нормам ІІІ Літоўскага Статута, ростам іх эканамічнай магутнасці, у той час як мясцовая шляхта занепадала, – «нашинец выживицца не может». Выключна негатыўна ацэньваў ён ролю замежнікаў ў якасці дарадцаў караля

і пашырэннем колькасці прыхільнікаў новых, еўрапейскіх звычаеў і ладу жыцця: «Много тутока таких ест, што хоть наша костка, однак собачим мясом обросла и воняет!». Персанаж Мялешкі падкрэслівае, што ранейшыя выступленні на соймах мелі больш праўдзівы і шчыры характар, і у параўнанні з сучаснымі не ператвараліся ў палітычны фарс, бясконцую дэмагогію і балбатню [2; с. 675]. Замежныя дарадцы караля і іх мясцовыя прыхільнікі з часоў Жыгімонта III пачалі адыгрываць ўсё большую ролю у дзяржаўных справах, часам зусім не на карысць Вялікага Княства Літоўскага, што выклікала рэзка негатыўную рэакцыю мясцовай шляхты: «... не так виноват король, як тые радные баламуты, што при ним сидят да крутять ... А коли б такого беса кулаком в морду! Забыв бы другы мутити» [2; с. 676; 4; с. 186].

Асаблівае раздражненне у персанажа «Прамовы» выклікала прысутная ў Вялікім княстве дробная польская шляхта – «ляхи», якіх ён грэбліва называе «панкамі» – «паничыки». Іх напышлівае, ганарлівае стаўленне да мясцовай шляхты выклікала рэзкую рэакцыю: «Коли ж до тебе паничек приедеть, частуй же его достатком, да еще и жонку свою подле его посади. А он седить, як бес надувшись, морокуеть, шапкою, дей, перекривляет и з жонкою нашептываеть, дей и в долонку сробеть. Да коли ж бы гетакого чорта кулаком в морду, или по лицом, по хрибте, так штобы король, Его милость, не слыхал! Нехай бы морды такой поганой не надымал» [2, с. 675].

**Заключэнне.** Кіруючыя колы Вялікага Княства літоўскага, якія складаліся галоўным чынам з прадстаўнікоў буйной радавітай арыстакратыі і іхнай кліентэлы, пасля заключэння Люблінскай уніі 1569 г. імкнуліся ў гэты перыяд максімальна захаваць дзяржаўна-палітычныя інстытуцыі, што выяўлялі і забяспечвалі суверэнітэт дзяржавы найперш у дачыненнях з Польскім каралеўствам. Частка дробнай і сярэдняй шляхты выказвалі больш сімпатыі збліжэнню з польскай шляхецкай дэмакратыяй, якое падавалася ёй магчымасцю выйсці з-пад цяжкай падпарадкаванасці мясцовай арыстакратыі. У той жа час пашырэнне ў Вялікім Княстве Літоўскім новых, еўрапейскіх палітычных і культурных павеваў выклікала супярэчлівую, як зычлівую, гэтак і адмоўную рэакцыю у шляхецкім асяроддзі. У той жа час, публіцыстыка другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. сведчыць аб у цэлым насцярожаным і нават негатыўным успрыняцці масай шляхты Вялікага Княства Літоўскага збліжэння з Польшчай і распаўсюджвання ў дзяржаве еўрапейскіх культурных і палітычных уплываў.

1 Лісты Ф.С. Кміты-Чарнабыльскага // Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / Акадэмія навук БССР, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы; уклад., уступ. арт. і камент. А.Ф. Коршунава; рэд. Ю.С. Пшыркоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – С. 39–110.
2 Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 674–677.
3 Прашкович, Н.И. «Прамова Мялешкі» и «Ліст да Абуховіча» – новый этап в истории белорусской литературы / Н. Прашковіч // Труды Отдела древнерусской литературы. – Л.: Наука. Ленингр. отд-ние, 1969. – Т. XXIV. – С. 314–318.
4 Даўгяла, Зм. З беларускага пісьменства XVII ст.: творы Цыпрыяна Камунякі "Ліст да Абуховіча" і "Прамова Мялешкі": (гістарычна-літаратурны каментарый і тэксты) / Зм. Ів. Даўгяла. – Менск, 1927. – 45 с.

## АБ ШАРЫКАКАНЦОВЫХ НАЦЕЛЬНЫХ КРЫЖАХ XI–XII СТСТ. З ТЭРЫТОРЫІ ГЛЫБОЦКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*М.А. Нікіфаровіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У 2024 г. у ДУК «Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей» аўтарам былі перададзеныя пяць шарыкаканцовых нацельных крыжоў XI–XII стст., якія ён атрымаў ад прыватных асоб разам з падрабязнай інфармацыяй аб месцах іх знаходжання. Усе крыжы былі знойдзеныя ў перыяд з 2018 па 2022 год на тэрыторыі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Публікацыя інфармацыі аб іх паспрыяе пашырэнню агульнай базы